Марыя Шакун
ТВАРЫЦЬ ДАБРО

Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Марыя ШАКУН

ТВАРЫЦЬ ДАБРО

вершы

2023

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Серыя заснавана ў 2023 годзе

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 006

Шакун, М. А.
Тварыць дабро : вершы / Марыя Шакун. — Мінск : МАА СПБ, 2023. — 93 с. (Электронная бібліятэка).

У гэтай электроннай кнізе змешчаны вершы аб любай радзіме, чалавечай душы, адносінах і ўзаемасувязях паміж людзьмі валожынскай паэтэсы Марыі Шакун.

© Шакун М. А., 2023
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2023

Мае тут вытокі , мае карані

ТОЛЬКІ РАЗАМ

У нас краіна адна на ўсіх,
Мы – дзеці яе, яна – наша маці,
І кожны з сяброў, знаёмых тваіх
Хацеў бы жыць мірна ў роднай хаце.

Вось гэту краіну і родную маці,
Куточак бацькоўскі, дзе свает ты убачыў,
Любі, беражы, у сваім сэрцы хавай,
Ніколі нікому не аддавай.

І будзем мы ўсе у гэтай думцы адзіныя,
Тады зразумем, што трэба і можна,
Бо толькі разам у роднай краіне
Мы – сіла, народ і мы непераможныя.

* * *

Я жыву на зямлі, што нам дадзена Богам,
Тут вытокі мае, маіх продкаў сляды,
І матуліна родная чыстая мова,
І ўсе перажытыя дні і гады.

Я люблю гэта неба і сонца ў зеніце,
Васільковыя вочы палёў ільняных,
Я люблю каласкі, што шапочуць у жыце,
Праслаўляючы рукі рупліўцаў сваіх.

Што яшчэ чалавеку для шчасця патрэбна?
Жыць спакойна і дзетак сваіх гадаваць,
На бацькоўскай зямлі расціць хлеб і да хлеба,
І душой прыгажэць, каб да неба ўзлятаць.

РАЁНА СТАЛІЦА

Слаўся, Валожын, слаўся ў вяках!
Слаўся, наш горад, раёна сталіца!
Усім тваім вуліцам і жыхарам
Нізка, да долу, дазволь пакланіцца.

Слава ўсім, хто цябе будаваў,
Хто ўпрыгожваў, галубіў і песціў,
Хто ад чужынцаў цябе адстаяў
І засланяў у гады ліхалецця.

Мы для нашчадкаў цябе зберажом,
Бо мы – валожынцы, мы працавітыя,
Славім цябе, табе гімны пяём,
Ты – наша доля, з табой мы спавітыя.

Слаўся, Валожын, і вечна жыві!
Хай жа твой лёс назаўжды будзе шчасным!
Мы прысягаем табе ў любві
І ганарымся, як домам уласным.

ВАЛОЖЫНУ

Разцвілі каштаны ў горадзе прыгожа,
Хочаш ці не хочаш – станеш паглядзіш.
Гэта наш любімы, дарагі Валожын,
Працаўнік і воін – дзе яшчэ такі ж?

Не шукай – не знойдзеш дзяўчат прыгажэйшых,
Хлопцаў адмысловых – усе як на пажбор,
Песень задушэўных, “Сваякамі” спетых,
Растрывожаць сэрца, узнясуць да зор.

Не шукай – не знойдзеш, дзе было б так добра,
Дзе было б так светла і спакойна жыць,
Над шырокай нівай, над пушчанскім борам
Птушкаю свабодна хочацца кружыць.

Родны наш Валожын, любая старонка,
Мы з табой з’яднаны сёння і заўжды.
Хай над тваім лёсам ззяе шчасця зорка,
Ты квітней і будзь заўсёды малады.

Я ЛЮБЛЮ БЕЛАРУСЬ

Над Радзімай маёй бела-русаю
Неба чыстае, сонейка светлае.
Ганаруся табой і любуюся
Прыгажосцю тваёй непрыкметнаю.

Я люблю Беларусь, яе мудрасць і сіду,
Я люблю Беларусь, светлы лік Еўфрасінні
І Сафіі званы, Мір, Нясвіжа палацы,
І прыгожы народ, што жыве з сваёй працы.

Пра Радзіму маю яснавокую
Слава добрая песенькай звонкаю
Разляцелася ў далі далёкія
І заззяла над роднай старонкаю.

Я люблю Беларусь, яе мову і казку,
Я люблю Беларусь за матуліну ласку,
За крыніц чысціню, водар хлебнага поля.
Хай красуе-цвіце у вяках твая доля.

Я люблю Беларусь, зноў і зноў паўтараю:
Няма ў свеце мілей майго роднага краю!

* * *

Валожынскі край, ты мяне ўзгадаваў,
Як дочку, галубіў і песціў,
І крылы для ўзлёту мне вольныя даў,
І голас – спяваць табе песні
Пра сінія далі, вясёлку над полем,
Пра Іслач імклівую, Бярэзіну,
Пра воблачка ў небе над хлебным раздоллем
І налібоцкіх легенд даўніну.

Пра рукі руплівыя працаўнікоў,
Што множаць багацце тваё з году ў год,
І пра зямельку святую бацькоў,
Дзе карані мае, мой радавод.

Краю мой родны, край мой чароўны,
Мне прыгажэй за цябе не знайсці.
У нашай краіне ты роўны між роўных,
Слаўся ж, красуйся і вечна цвіці!

* * *

Кожны з нас носіць у сэрцы куточак Радзімы,
Мясціны, дзіцячыя дзе адзвінелі гады,
І як бы далёка ад іх ні былі мы –
У думках ляцім, як на крылах, сюды.

І бачыцца мне той лужок каля хаты,
Дзе маці палотны на росы сцяліла,
І з тонкага кужалю дзецям і тату
Кашулі, як белыя воблакі, шыла.

І чуецца мне, як шумяць тры сасны,
Што недалёка раслі на ўзгорку.
І скуль бы ні йшоў, ні вяртаўся, яны
Віталі, як родныя, ціха здалёку.

І помніцца мне пах дамашняга хлеба –
Ах, рукі матулі, усё вы ўмелі!
І тая сустрэча пад сонечным небам,
Што ў сэрцы і сёння, як чыстае зерне.

І верыцца мне: палявыя сцяжынкі
Трымаюць у памяці вечнай сваёй
Сляды басаногай цікаўнай дзяўчынкі
І песняй рамонкаў гамоняць аб ёй.

Мой край дарагі, маіх вёснаў калыска,
Бацькоўская хата, суседзі, сяло…
Схіляюся ўдзячна, схіляюся нізка
За ўсё, што збылося і збыцца магло.

ВАЛОЖЫНСКІ ВАЛЬС

Сустрэнемся на вуліцы каштанаў,
Дзе наша лета адзвінела рана,
Ды засталася ў сэрцы тая песня,
Што журавы на крылах удаль панеслі.

Валожынскі вальс, валожынскі вальс
Закружыць нас зноў, як калісьці.
Валожынскі вальс, валожынскі вальс
Гады ападаюць, бы лісце.
Валожынскі вальс іграе для нас,
І кружыць гадоў нашых лісце…

Так хораша з табою мне сустрэцца,
Падслухаць стук усхваляваны сэрца
Ды зазірнуць у вочы бы ў крыніцы,
Каб той вады чароўнае напіцца.

Валожынскі вальс, валожынскі вальс
Закружыць нас зноў, як калісьці.
Валожынскі вальс, валожынскі вальс
Гады ападаюць, бы лісце.
Валожынскі вальс іграе для нас,
І кружыць гадоў нашых лісце…

Мой горад дарагі, маё каханне,
Ізноў іду з табою на спатканне,
Пераплялiся нашы сцежкі-лёсы,
Пераплялiся, бы ў вянку калоссе.

Валожынскі вальс, валожынскі вальс
Закружыць нас зноў, як калісьці.
Валожынскі вальс, валожынскі вальс
Гады ападаюць, бы лісце.
Валожынскі вальс іграе для нас,
І кружыць гадоў нашых лісце…

ВАЛОЖЫН

Родны горад мой, Валожын,
Па табе я сумавала
У краіне той прыгожай,
Дзе душой адпачывала.

Да цябе я прытулюся,
Як да маці ў час сустрэчы,
Я табою наталюся,
Ты і юны мой, і вечны.

На тваіх дарожках-свежках
І мае ляжаць слядочкі,
А радкамі сваіх вершаў
Я табе пляту вяночкі.

МАЛАЯ РАДЗІМА

Радзіма мая малая,
Найпрыгажэйшая ў свеце!
Дзе б па жыцці ні была я,
Сонца тваё мне свеціць.

Мой ты куточак вясковы
Пад сінім купалам неба,
Рамонкавы, васільковы,
З духмяным водарам хлеба.

Цябе я не забываю,
Твая прыгажосць мне сніцца,
Радзіма мая малая,
Светлай пяшчоты крыніца.

Я табе песню спяваю,
Любуюся, ганаруся.
Радзіма мая малая,
Я за цябе малюся.

Хай Бог цябе зберагае,
Хай кожны будзе любімы,
Радзіма мая малая,
Дачка вялікай Радзімы.

СЦЯЖЫНКА

Сцяжынка ад парога хаты
У край далёкі павяла.
Ды помніла я словы таты:
“Не забывай свайго сяла”.

І з той пары заўжды са мною
Сцяжынка тая, тая хата,
І луг з духмянаю травою,
І ніва, што яшчэ не зжата,

Рачулка з чыстаю вадою,
Мае сунічныя палянкі,
І неба сінь над галавою,
І маці ў хустачцы на ганку…

Радзіма, мілая, малая,
Хто без цябе я ў гэтым свеце?
Як маці, ты мне дарагая,
Такая ты адна ў Сусвеце.

УЗБАЛАЦЬ

Я з гэтай зямелькі, я з гэтай старонкі,
Дзе спеў жаўрука такі радасна-звонкі,
Дзе сонейка свеціць, калышуцца нівы
І грае на дудачцы ветрык імклівы.

Мае тут вытокі. Праз поле сцяжынка,
У небе высокім плыве аблачынка,
Бярэзіна-рэчка пятляе, віецца…
Тут вёсачка Узбалаць, з ёй маё сэрца.

О вёсачка мілая, ты сваіх дзетак
І помніш, і любіш, чакаеш са свету.
Прыедуць, прытуляцца, сіл набяруцца,
Каб зноў у праблемы жыцця акунуцца.

А тыя, хто разам, заўсёды з табою,
Цябе даглядаюць і песцяць з любоўю –
Глыбокі паклон ім, маё захапленне.
Яны зберагуць цябе для пакаленняў.

КАПУСЦІНА

Капусціна – вёсачка любая,
Працоўнага шляху пачатак,
Мяне, як сваю, ты галубіла,
Хоць я й не тваё дзіцятка.

Рачулка мая гаманлівая,
Праз твой, праз вузенькі масток
У школу ішла я шчаслівая
На кожны жаданы ўрок.

І так аднойчы ўжо сталася –
На гэтым масточку якраз
Я з незнаёмцам спаткалася.
А як размінуцца? У адказ:

– Навошта ж нам і размінацца?
Такіх вачэй, што як сонца,
Не бачыў я і любавацца
Хацеў бы я імі бясконца.

І школа на ўзвышшы за вёскай,
І гоман дзяцей, іх жарты –
Зрабіліся вы маім лёсам,
І дошка, і крэйда, і парты…

Сябры, калегт найлепшыя,
Вы прада мной – маладыя,
Як незабыўныя першыя
Школьныя дні залатыя.

ПОЛАЦК

Полацк збірае гасцей,
Дзень нараджэння святкуе,
Па-над Дзвіною плыве
Лодка, што ў вечнасць вандруе.

У лодцы сярод вялікіх
Полацка сын – Скарына,
Першадрукар, асветнік,
Гонар нашай Айчыны.

Слова на роднай мове
Надрукаваў ён першы,
Бо мова – жыцця аснова,
А кніга – лекар мудрэйшы.

Полацк збірае сяброў –
Дзень пісьменства і друку –
Каб услаўляць зноў і зноў
Кнігу, асвету, навуку.

МАЯ РАДЗІМА, ЛЮБЫ КРАЙ

Ёсць на зямлі цудоўная мясціна,
Куды душа мая заўжды імкнецца –
Дзяцінства майго светлая краіна,
Малой радзімаю яна завецца.

Бацькоўскі край, люблю твае прасторы,
Дзе нівы каласяцца на палях,
Дзе падаюць начамі з неба зоры,
Каб расцвісці рамонкамі ў лугах.

У гэтым краі дыхаецца лёгка
І сэрца напаўняецца пяшчатай,
Кранае беларуская гаворка,
А восень зачаруе пазалотай.

Бацькоўскі край, люблю твае прасторы,
Дзе нівы каласяцца на палях,
Дзе падаюць начамі з неба зоры,
Каб расцвісці рамонкамі ў лугах.

Ты гонар мой, мая любоў і казка,
Твае ўрокі па жыцці нясу я.
Хай будзе над табою неба ясным
І жыта на палях заўжды красуе.

ГУКІ ЗЯМЛІ

Я рада кожнаму дзяньку
І кожны ўдзячна сустракаю,
А колькі шчэ іх на вяку –
Аб гэтым ведаць не жадаю.

Я сёння чула ў цішы,
Як салавейка славіў сонца.
І тую музыку душы
Стаяў і слухаў бы бясконца.

А ноччу дожджык у вакно
Так весела забарабаніў,
Як быццам толькі мне адной
Прынёс нябеснае пасланне.

Люблю, як ціха лес шуміць,
Як ручаёк звініць, бруіцца,
Нясмела першы гром грыміць
І ўладарыць навальніца.

Яшчэ – вячэрняю парой
Паслухаць, конік як стракоча
Або, пад ветрыка настрой,
Каласок з коласам шапоча.

Вас, гукі родныя зямлі,
Ніколі слухаць не стамлюся,
Вы па жыцці мяне вялі,
Як песня маці-Беларусі.

Я ЛЮБЛЮ БЕЛАРУСЬ

Над Радзімай маёй бела-русаю
Неба чыстае, сонейка светлае,
Ганаруся табой і любуюся
Прыгажосцю тваёй непрыкметнаю.

Я люблю Беларусь, яе мудрасць і сілу,
Я люблю Беларусь, светлы лік Еўфрасінні,
І Сафіі званы, Мір, Нясвіжа палацы,
І прыгожы народ, што жыве з сваёй працы.

Пра Радзіму маю яснавокую
Слава добрая песенькай звонкаю
Разляцелася ў далі далёкія
І заззяла над роднай старонкаю.

Я люблю Беларусь, яе мову і казку,
Я люблю Беларусь за матуліну ласку,
За крыніц чысціню, водар хлебрнага поля…
Хай красуе-цвіце ў вяках твая доля.

Я люблю Беларусь, зноў і зноў паўтараю:
Няма ў свеце мілей майго роднага краю!

МАЯ ДУША ДАМОЎ ІМЕНЕЦЦА

Мая душа дамоў імкнецца,
Маркотна ёй усюды,
Бо толькі дома мне пяецца,
У краі маім любым.
Бо толькі тут мае сябры
І родныя мне людзі,
Бо толькі тут мае бвры,
Усё, што было і будзе.
Мне салавейка па вясне
Спявае да світанку,
Праменьчык сонейка ў акне
Цалуе мяне з ранку.
Бо тут матуліна святло,
Яе тут калыханка,
І тыя сцежкі за сялом,
І белы бэз ля ганку.
Тут п’ю я водар верасоў
І яблыкаў паспеўшых,
А хмаркі музыкай дажджоў
У далоні сыплюць вершы.

* * *

Я пакінула сэрца ў тым краі,
Дзе матуля мне песні спявала,
Дзе бацькоўская хата стаяла,
Дзе зязюля на золку кувала.

Маё сэрца навек засталося
Ў тых палях, дзе красуе калоссе,
У лясах, дзе па лісцях у восень
Па грыбы мне хадзіць давялося.

Чыстых мараў дзе ткаліся лёсы,
Дзе ракі задуменныя плёсы,
Сонца дзе на іскрыстыя росы
Рассыпала свае промні-косы.

Мілы край дарагая мясцінка,
Тут жыццёвай дарогі выток-пуцявінка,
Тыт знаёма, вядома любая былінка,
Я сама твайго дрэўца галінка.

РУЧЭЙ

Бяжыць, спяшаецца ручэй,
Такі маленькі і празрысты
Каб напаіць усіх хутчэй
Сваёй вадзіцай светлай, чыстай.

Смяецца сонейка яму,
Глядзяць у воды кветкі, лозы,
І ўдзячны кожнаму дзяньку,
Лятаюць матылькі, стракозы…

Хоць і маленькі ручаёк –
Жыццё дае маёй зямельцы,
Яго срабрысты галасок,
Як музыка, гучыць у сэрцы.

Я цешуся красой жывой,
І поўніцца душа любоўю.
Куток радзімачкі малой,
Якое шчасце жыць з табою!

МІЛЫЯ МЯСЦІНЫ

Валожынскія мілыя мясціны,
Да вас я прывязалася душой,
Вы сустракаеце мяне гасцінна
І радуеце сціплаю красой.

Пра вас я ўспамінаю на чужыне
І бачу вас у неспакойным сне.
Куточак любы любае Радзімы,
Ад продкаў што дастаўся мне.

Мне добра тут і хораша заўсёды
Сярод людзей знаёмых і сяброў,
Дзе цешыць вока колер непаўторны –
Блакіт нябёсаў, аксаміт лугоў.

Прыемна слухаць, як плыве над полем
Царквы, касцёла мірны перазвон,
Разносячы далёка ў наваколле
Хвалу нябёсам за спакойны сон.

Наш светлы горад... Ён лунае птушкай
Тут кветкі, як усмешкі, расцвілі,
І хочацца быць годнаю дачушкай
Сваіх мясцін, сваёй святой зямлі.

МАЯ РАДЗІМА, ЛЮБЫ КРАЙ

Ёсць на зямлі цудоўная мясціна,
Куды душа мая заўжды імкнецца –
Дзяцінства майго светлая краіна,
Малой радзімаю яна завецца.

Бацькоўскі край, люблю твае прасторы,
Дзе нівы каласяцца на палях,
Дзе падаюць начамі з неба зоры,
Каб расцвісці рамонкамі ў лугах.

У гэтым краі дыхаецца лёгка
І сэрца напаўняецца пяшчатай,
Кранае беларуская гаворка,
А восень зачаруе пазалотай.

Бацькоўскі край, люблю твае прасторы,
Дзе нівы каласяцца на палях,
Дзе падаюць начамі з неба зоры,
Каб расцвісці рамонкамі ў лугах.

Ты гонар мой, мая любоў і казка,
Твае ўрокі па жыцці нясу я.
Хай будзе над табою неба ясным
І жыта на палях заўжды красуе.

* * *

Няма са мной тваіх вачэй,
І тваіх рук, і тваіх вуснаў,
А сонца з кожным днём ярчэй.
Павольна йду сцяжынкай вузкай.

І абуджаецца жыццё
Ў душы збалелай і самотнай,
І радаснае пачуццё
Кранае цеплынёй пяшчотнай.

Зямелька любая, мой край,
Мая маленькая Радзіма,
Дачку з дарогі сустракай,
Куток мой дарагі, любімы!

* * *

Ізноў вясна ў нашым краі
Сагрэта сонейкам жывое,
Яж іншую вясну прыпамінаю:
Дзе ты і я, дзе мы адны з табою.

У сэрцы толькі ласка і пяшчота,
А на паляне ландышаў разліў.
Дурманіў нас іх непаўторны водар...
І я кахала ў першы раз, і ты любіў.

Мы па жыцці ідзём, як дзве планеты.
У кожнага свой лёс, свая арбіта.
Але вясна як прыдзе... Дзе ты?..
Нішто, мой любы, не забыта.

БЕЛАРУСКІ МОЙ КРАЙ

Беларускі мой край, няма ў свеце мілей,
Усё тут цешыць і радуе вока,
Тут радзіма мая, край прыгожых людзей,
Твая слава вядома далёка.

Тут радзіма мая, маіх продкаў зямля,
Не магу на цябе наглядзецца.
І ў якіх бы краях ідзе б я ні была,
Ты заўсёды са мною ў сэрцы.

Беларускі мой край, прыгажэй і расці,
Няхай доля твая будзе светлай,
Незалежнасць сваю праз вякі ты нясі
І да мэты ідзі запаветнай.

Лірычнае суквецце

ПАДАРУНАК

Цудоўны зімовы дзянёчак
Прырода-матулечка падаравала,
Кожнае дрэўца, кожны кусточак
Алмазамі, бісерам чыстым ўбрала.

А сонейка цуд гэты дамалявала
Іскрыстымі праліваміі.
“Любуйцеся, людзі – прырода сказала, –
Любуйцеся, будзьце шчаслівымі!”

* * *

А восень зноў такая ж, як тады,
Усё гэтак золатам разцвечаны бярозкі,
І месячык з-за хмаркі малады
Высвечвае сцяжыначкі-дарожкі

Спакойна свае воды мчыць рака,
Прыціхла наваколле, усё адпачывае,
Змаўкае лес, не чутна жаўрука,
І жураўліны клін у небе праплывае.

Павольна павуцінка ўдаль ляціць,
Садзіцца адпачыць табе на плечы
Ды так ужо на скронях і ляжыць,
Напамінаючы, што недалёка вечар.

І ў сэрцы тая ж музыка гучыць,
Хвалюе і трывожыць аж да рания,
Бо ўсё ў жыцці патрэбна перажыць:
І радасць, і тугу, і боль расстання.

А восень зноў такая ж, як тады...
О восень, я люблю твае дарогі!
Не апалі мне толькі сэрца Ты
Ды затрымай зіму яшчэ надоўга.

ВОЗЕРА НАРАЧ

Я прыйшла да цябе на світанку,
Павітацца каб з самага ранку
І убачыць, як ты прачынаешся,
З дзяньком новым сваім сустракаешся.

А па водах тваіх, яшчэ сонных,
Белы лебедзь плыве, быццам човен,
І мяне захацеў ён прывеціць,
Светлай ласкай дзянек МОЙ расцвеціць.

Ён падняў над вадой свае крылы
І развёў іх убокі пашырай,
Расцвіла нібы белая кветка
Прыгажосці нябачанай, рэдкай.

Яго крылы жылі, трапяталі
І, здаецца, здалёк абнімалі,
Штось казалі на сваёй мове –
Не забыць гэты момант ніколі!

І было гэта так палымяна,
І было гэта так нечакана,
Што са маною ў душы, маім сэрцы
Белы птах назаўжды застанецца.

* * *

Падаюць сняжынкі, бы пушынкі белыя,
Вецер кружыць іх, зямельку засыпае,
І стаяць ялінкі, бы нявесты ў вэлюме –
Зімачка-зіма свой баль ужо спраўляе,

Цёплымі пярынамі ўхутала азімыя,
Крышталём іскрыстым замасціла рэкі,
Растрапала па лугах кудзелькі сінія
І схавала птушак-дзетачак пад стрэхі.

Чыста, бела ўсё наўкол, прыгожа,
Адышлі турботы. На душы спакой…
Як прырода ўмее, як прырода можа
Абнаўляцца! Так бы й нам з табой!

АСАЛОДА

Я рассыпала хлебныя крошкі на снег –
І зляцеліся ўміг трапяткія камочкі,
Зазвінеў мілагучны, жыццярадасны спеў,
Быццам бы задрыжалі залатыя званочкі.
Я птушыную музыку гэту лаўлю
Заміраю душой, сэрцам п’ю асалоду,
О жыццё маё, кожны твой дзень я люблю,
Кожны дзень успрымаю, як узнагароду.

КАЛІ ЦВІТУЦЬ САДЫ

Сады цвітуць, цвітуць сады,
І прыгажосць наўкол такая!
А дні ідуць, імчаць гады,
Мяняе нас жыццё, мяняе.

Але як прыйдзе май, як зацвітуць сады,
Зноў абуджаюцца надзеі, спадзяванні
На лепшы час, на лепшыя гады,
Цвітуць у душы найлепшыя жаданні.

І сэрца, як жаўрўк той малады,
Трапеча і звініць, то раптам замірае
Ад шчасця, радасці і нейкае журбы,
Што хуткацечна прыгажосць зямная.

А што гады бягуць – не трэба сумаваць,
Бо кожны новы год – да мудрасці ўздым.
Няхай бягуць гады, няхай яны імчаць,
Ды застаецца сэрца маладым

АДЛЯТАЮЦЬ ЖУРАЎЛІ

Адлятаюць жураўлі ў вырай,
Клін у небе гучна праплывае,
І чамусьці сумна-сумна стане,
Затрапеча сэрцэйка, заныe.

І якой бы працай не займаўся,
усё пакінеш і глядзіш у неба,
Як бы табе вельмі-вельмі трэба,
Каб той клін з табою развітаўся.

Паляцелі… Усё далей… Далёка…
Родную пакінулі старонку,
Сталі ледзь прыкметнай стужкай тонкай,
І заціх іх развітальны клёкат.

І стаіш шчэ доўга ў хваляванні,
Быццам нешта страціў дарагое,
Усё глядзіш, махаешь ім рукою…
Як жа хочацца сустрэць вяртанне.

КАЛЯДАЧКІ

Зімка, зімачка прыйшла,
Мяккая, пушыстая,
На зямельку прылягла
Воблачкамі чыстымі.

На зямельку прылягла
Белымі палотнамі
І сцяжынкі замяла
Снежнымі сумётамі.

Ах, зіма, зіма, зіма,
Любыя Калядачкі.
Свята лепшага няма –
Гульні, заляцаначкі.
Свята лепшага няма –
Пачастункі-чарачкі,
Ах ты, зімачка-зіма,
Светлыя Калядачкі!
Зімка, зімачка, кругом
Лёгкія сняжыначкі,
Запушыла серабром
Елачкі, хваіначкі.

Усё прыбрала, падмяла,
Навяла парадачак
І ў чаканні замярла –
Святак і Калядачак.

Ах, зіма, зіма, зіма,
Шчочкі разгараюцца,
Свята лепшага няма –
Новы год спяшаецца.
І Хрыстова Ражаство,
Дед Мароз і святачкі!
Ах ты, зімачка зіма,
Любыя Калядачкі!

ЛІСТАПАД
(Развітальны баль)

Закружыліся дзружна лісты
Пад мелодыю вечнага вальса,
Развітальнага балю матыў
Над зямлёю плыве і над часам.

Лістапад, лістапад, лістапад.
Сыпле залатам шчодрая восень,
І не знойдзеш дарогу назад –
У вясну, неба майскага просінь.
І не знойдзеш дарогу назад –
У нашы мары і сны маладыя,
Замятае сляды лістапад,
Незабыўеыя дні залатыя.

А навокал такое святло,
Быццам сонечны дожджык ільецца –
Гэта любячых сэрцаў цяпло,
Гэта нашай радзімай завецца.

Лістапад, лістапад, лістапад.
Сыпле золатам шчодрая восень,
І не знойдзеш дарогу назад –
У вясну, неба майскага просінь.
І не знойдзеш дарогу назад –
У нашы мары і сны маладыя,
Замятае сляды лістапад,
Незабыўеыя дні залатыя.

Кліча нас да сябе лістапад
Заблудзіцца ў яго прыгажосці,
Наталіць і душу і пагляд
Развітальным цяплом маладосці.

Лістапад, лістапад, лістапад.
Сыпле залатам шчодрая восень,
І не знойдзеш дарогу назад –
У вясну, неба майскага просінь.
І не знойдзеш дарогу назад –
У нашы мары і сны маладыя,
Замятае сляды лістапад,
Незабыўеыя дні залатыя.

СЕНА-СЕНАЖАЦЬ

Як за рэчкай, за ракой
Працавалі талакой,
Сенажаць касілі,
Ды й сена сушылі.

Гэта сена-санажаць
Шмат магла бы расказаць
Пра дзянькі і ночкі,
Закаханых вочкі.

Ой ты, лета-лецейка, трава-медуніца,
Ой, дзяўчынка мілая, песня-чараўніца,
Дазволь наталіцца тваёй прыгажосцю
І налюбавацца тваёй маладосцю.

Як за рэчкай, за ракой
Сэрца страціла спакой
Ад тых слоў жаданых,
Вуснаў палымяных.

І дурманіць галаву
Тая казка наяву,
Свежыя пакосы,
Лугавыя росы.

Ой ты, лета-лецейка, трава-медуніца,
Ой, дзяўчынка мілая, песня-чараўніца,
Дазволь наталіцца тваёй прыгажосцю
І налюбавацца тваёй маладосцю.

ДАЖЫННКІ

Над горадам лунае водар хлеба,
І сонейка лагодна шле цяпло.
Настрою сёння лепшага не трэба –
Дажынак свята зноў да нас прыйшло.

Ой, дажыначкі-дажынкі,
Незабыўныя хвілінкі,
Песні льюцца шчыра, звонка.
Ў гонар любае старонкі!

Хвалу пяём вам, людзі-хлебаробы,
За хлеб духмяны свежы на стале –
Прадукт высокай, найвышэйшай пробы –
Хвалу пяём вам, людзі на сяле!

Ой, дажыначкі-дажынкі,
Незабыўныя хвілінкі,
Песні льюцца шчыра, звонка.
Ў гонар любае старонкі!

Святкуем мы дажыначкі-дажынкі,
Зямельцы шлём падзяку за дары,
А ў вачах вясёлыя смяшынкі,
Бо з хлебам мы ўсе гаспадары.

Ой, дажыначкі-дажынкі,
Незабыўныя хвілінкі,
Песні льюцца шчыра, звонка.
Ў гонар любае старонкі!

ДЛЯ ЧАГО?

– Для чаго чалавека прыдумаў Бог?
Ну навошта стварыў чалавека?
– Каб зямлю даглядаць, апрацоўваць ён мог,
Каб яна прыгажэла ад века да века.

І так год за годам, і так век за векам
Зямля і прырода ў руках чалавека,
Яе ён і песціць, яе даглядае,
Яе і калечыць, яе прыгнятае.

Дай Божа, яму,чалавеку зямному,
І мудрае сэрца, і добрыя рукі,
Каб наша планета была ўтульным домам,
Каб не пагражалі ёй войны і мукі.

Каб кожны куточак і кожны лісточак,
І птушка малая, істота любая,
Травінка, былінка на доўгія вякі
Былі АБАРОНЕНЫ ЧАЛАВЕКАМ.

ЗАЧАРАВАННЕ ЛЕТА

Ты ідзеш палявою сцяжынкай,
Ветрык ласкава твар абвявае,
У небе воблачка белай хусцінкай
Нетаропка ўдаль адплывае.

Травы сцелюцца мякка пад ногі,
Сонца плечы лагодна так песціць,
Васілёк у жытах ля дарогі,
Быцццам неба асколачак, свеціць.

Каласкі абдымаюць за рукі,
З галавой у іх мора ныраеш,
Ловіш лета пяшчотныя гукі
І душою адпачываеш.

І так добра табе ў гэтым краі,
Што радзімай спрадвеку завецца,
Усё чаруе, лагодзіць, кранае
І любоўю пранізвае сэрца.

* * *

Як добра легчы на траву,
Раскінуць рукі і глядзець у неба,
І радавацца, што жыву,
І лепшай радасці не трэба.

Сачыць, як воблачка плыве,
Мяняючы сваё аблічча,
Як быццам нешта кажа мне
Ці да сябе ў неба кліча.

Адчуць сябе часцінкаю зямлі,
Часцінкаю прыроды і сусвету,
І растварацца ў сіней глыбіні.
Плысці, лунаць, ляцець над светам.

Як добра легчы на траву,
Адчуць сябе часцінкаю сусвету,
Плысці, лунаць, ляцець над светам,
І радавацца, што жыву.

ВІТАННЕ

Сонейка ўстала, мяне прывітала:
– Дзень добры!
З песняй сінічка ў акно завітала:
– Дзень добры!

– Дзень добры, –
Кажу я, – сябры і суседзі,
Бярозка на ўзлеску, у жытах васілёк,
Мой край беларускі, найлепшы ў свеце,
Мой самы прыгожы бацькоўскі куток.

І радасна мне, і так лёгка на сэрцы,
Што мы павіталі адно аднаго.
І кожны дзянёк такім любым здаецца,
І хочацца плённа прывеціць яго.

ВЕТРЫК

Гарэза-ветрык растрапаў мне косы...
Так хочацца яму са мною пагуляць –.
І паляцеў далей свавольнік босы,
Каб белую бярозку горача абняць,

Бярозка задрыжэла тонкім станам,
Схіліла да зямелькі нізка галаву,
А ветрык-шалапут ужо імчыць над садам
І гулка яблыкі страсае на траву.

Усхваляваў, як мора, жыта ў полі,
Пагойдаўся на лапках елачак, хваін,
Прагнаў з нябёсаў хмаркі ў наваколле,
Змарыўся і прыціх на некалькі хвілін.

І сонейка заззяла шчыра гэтак,
Праменьчыкі свае паслала на зямлю,
Сагрэла ўсіх, як маці родных дзетак...
Мой родны край, люблю цябе,
люблю,
люблю.

Маміна школа

ДЗЕНЬ МАЦІ

Дзень Маці, тыдзень Маці…
А мне б хацелася сказаць,
Што трэба ўсе дні ў годзе скласці
І кожны ў гонар маці называць.

Бо хто, як не яна, матуля,
Аднойчы даўшы свет жыцця,
Да сэрца днём і ноччу туліць
Сваю крывіначку, дзіця.

І хай вам будзе пяць ці сорак –
Вы для яе сынок, дачушка…
І ўсё бяжыць вам наўздагонак,
Бы тая раненая птушка.

Усё чакае ў варотах,
Глядзіць з надзеяй на дарогу…
І зноў да ночы ў турботах,
Было б здароўе – слава Богу!

І так прывычна гэта стане,
Ужо так і трэба, што матуля
Да свету кожны дзень устане,
Накорміць, прыбярэ, згатуе.

І слёзы вытра, усміхнецца,
Сагрэе ласкаю, дабром,
Да сэрца ціха дакранецца…
Як слаўна пад яе крылом.

А потым – унукі і ўнучкі,
За іх душа ўсё гэтак рвецца,
І ўжо не маці, не матуля,
Ужо бабулею завецца.

І паўтараецца ўсё зноў,
Хоць скроні сівізна кранула,
А ты – шчэ большая любоў,
Матуля, мамачка, бабуля.

Шануйце, людз,і сваіх маці,
Не прыбаўляйце ім маршчынак
Няхай звініць у кожнай хаце
Жаданы смех матуль шчаслівых!

МАМІНА ШКОЛА

– Адзін з’еш хоць вала – адна хвала, –
Так мая мама паўтарала
І гэтым дзетак навучала,
Што дрэнна быць скупым і прагным,
А трэба добрым быць, спагадным,
Дзяліцца з іншым тым, што маеш, –
І асалоду атрымаеш.
І так заўсёды па жыцці –
Дабро тварыць, дабро нясці.

О мама, мамачка мая,
Тваю навуку помню я.
І зараз, калі нешта маю,
Сабе я ціха паўтараю:
Адзін з’еш хоць вала – адна хвала.

МАЁЙ МАМЕ

Сустракала мяне ты з дарог, сустракала,
Ля акна, праглядаючы вочы, чакала,
Пра сябе забывалася, ночы не спала,
Ад бяды і хваробы не раз ратавала.

Ты мяне навучыла Радзіму любіць
І на мове маёй размаўляць-гаварыць,
Сябраваць, і кахаць, і людзей паважаць,
Памяць продкаў сваіх берагчы-шанаваць,

Ты прабач мяне, Мамачка, мілая Мама,
Што ўвагі табе ўдзяляла я мала,
Што заўсёды мне часу таго не хапала,
Каб размовай з табой я душу наталяла.

Мне здавалася, будзеш заўсёды са мною
І яшчэ пасядзім, пагаворым з табою.
Толькі ты адышла нечаканай парою,
Дагарэла, як свечка, не сказаўшы ні слова.

Як цяпер цябе, любая, мне не хапае,
А душа к табе рвецца, з табой размаўляе,
Ды да тога далёкага, вечнага краю,
Пэўна, голас мой ціхі ўжо не далятае.

МАМЕ

Мамачка, мама, матулечка, маці…
Светлае сонейка ў кожнай хаце,
Найпрыгажэйшая, найдаражэйшая,
Самая добрая і наймілейшая.

Сэрца тваё поўна ласкі, пяшчоты,
Рукі любой не баяцца работы,
Вочы любоўю, цяплом саграваюць,
Кожную ранку дзяцей зажыўляюць.

Любая маілая, мудрая, шчырая,
Хай твая долечка будзе шчаслівая,
Мамачка, мама, матулечка, маці…
Светлае сонейка ў кожнай хаце.

* * *

Прабач мяне, Мама, прабач мяне, Тата,
За ўсё, у чым прад вамі я вінавата,
Вы ўжо не са мною І Я шчэ не з вамі,
У небе далёкім душ вашых прыстанне.

Нічога не зменіш і не перайначыш,
Усё, што мінула, не стане іначай,
А сэрца трывожыцца, сэрца збалела -
Аддзячыць я вас у свой час не сумела.

І толькі магу я за вас памаліцца,
А сэрца баліць і не хоча змірыцца,
Чаму ж у жыццёвай рацэ хуткаплыннай
Для вас у мяне не хапала хвіліны?

А зараз так шмат таго часу, хвілінак,
Але ўжо няма маіх блізкіх, любімых.
І толькі ў думках я з імі бываю,
І толькі ў думках і паразмаўляю.

НАКАЗ

Наталі сваё сэрца пяшчотай
Прыгажосцю, дабром наталі
І запоўні ўсе будні работай,
Каб яны ў марнаце не прайшлі.

Беражы сваіх блізкіх і родных,
Атулі іх увагай, цяплом,
І знаёмых людзей, незнаёмых
Паважай і шануй родны дом.

Хай у сэрцы тваім хопіць месца
Для ўсяго, што жыве на зямлі,
Няхай плача яно ці смяецца,
Калі гора ці радасць прыйшлі.

Іты станеш жаданым, патрэбным,
Як патрэбна зямельцы вада,
І з табой будзе слабы мацнейшым,
І з табою бяда не бяда.

Наталі сваё сэрца пяшчотай...

НЕ ШКАДУЙЦЕ ДОБРЫХ СЛОЎ

Не шкадуйце добрых слоў,
Кожны дзень іх гаварыце,
Паўтарайце зноў і зноў,
У душы сваёй расціце.

Незнаёмым і сябрам,
Сваім родным, блізкім, дзецям
Гаварыце тут і там,
Хай лятуць яны па свеце.

І як сонейка цяплом
Ажыўляе ўсё наўкола,
Хай нясуць у кожны дом
Толькі радасць вашы словы.

Мелодыя кахання

АБНІМІ

Абнімі ты мяне, абнімі
І да сэрца свайго прыгарні,
Добрых рук падары мне цяпло
І пяшчоту вачэй, іх святло.

І я стану тваёю вясной,
І я стану тваёю струной,
Тваёй песняй, малітвай, хлебам
Між зямлёй і высокім небам.

Абнім ты мяне, абнімі,
Да грудзей прытулі, прыхіні
І пачуеш, як адно сэрца
На дваіх нас шчасліва б`ецца.

ЗАЎСЁДЫ КАХАЮ

Ты пайшоў у снежную замяць,
Я цябе адпусціла моўчкі,
Ты пайшоў. Засталася памяць,
Замятала зіма слядочкі.

А зіма серабрыла скроні,
Халадзіла душу і сэрца,
Працягні мне твае далоні,
Каб магла я хутчэй сагрэцца.

Працягні мне рукі з-за краю
І скажы: “Заўсёды кахаю”.

* * *

Былі мы такімі няўмелымі,
Былі мы такімі нясмелымі,
Пачуцці свае хавалі,
Саромеліся, маўчалі.

І толькі ад сэрца да сэрца
Лілася мелодыя скерца,
Струны душы трапяталі,
А вусны, а вусны маўчалі.

Бо мы такіх слоў шчэ не ведалі,
Аб струнах душы каб паведалі.

ДА ЦЯБЕ І З ТАБОЙ

Я баялася быць смешнай,
Я баялася быць грэшнай,
І маўклівай, і гаварлівай,
Хацела я быць шчаслівай.
Я ішла па жыцці асцярожна
І старалася, наколькі можна,
Быць і сціплай, і непрыкметнай,
Хацелася быць толькі светлай.
Станоўчай быць вельмі хацела,
Пакуль цябе не сустрэла.
З табой я магла быць смешнай,
З табой я магла быць грэшнай.
З табою была я рознай,
Сур'ёзнай, неасцярожнай.
Я стала тваёй каханай,
Я стала тваёй жаданай,
З табой я была любою,
З табой я стала сабою.
Дзякуй табе, мой адзіны,
За шчасце кахаць, быць любімай.

БУДЗЬ ШЧАСЛІВЫ

Жоўты ліст за акном
развітальны,
Зберагчы не сумелі
каханне,
Наша першае, найдарагое,
Раздзяліў ты яго з другою.

Ты пайшоў, ну а я прамаўчала,
Толькі сэрца ў бяссіллі крычала,
Так балючы той міг
развітальны,
Будзь шчаслівы,
мой любы, каханы.

ТАБЕ, ДАЛЁКАМУ…

Твой вобраз светлы – на ўсё жыццё…
Як мы сустрэліся – помню,
Дзякуй за першае пачуццё,
Рук тваіх цёплых далоні.

Вусны твае, вачэй прыгажосць
І словы, што йшлі ад сэрца,
Як добра, што ты на планеце ёсць;
Няхай табе ўсміхнецца

Вясёлка з неба ў летні дзень,
Месячык ночкай воблачнай,
Сонейка ясны пашле прамень,
Калі табе стане змрочна.

Знай, гэта я пасылаю табе
Паклон свій удзячны, нізкі,
Можа, успомніш і ты пра мяне,
Далёкі мой, самы блізкі…

“ВАЛЯНЦІНКА”

Ты прыслаў мне “валянцінку”-
Тоненькую павуцінку,
Што звязала нас з табою
Праз адлегласці, гады.
“Валянцінка-валянцінка” –
Сэрца шчырага часцінка,
Станеш ты цяпер маею
Назаўсёды, назаўсёды.

Ты прыслаў мне “алянцінку”
У жаданую хвілінку,
І такую ж “валянцінку”
Я паслала ў адказ.
Што такога? Ды нічога,
А жыццёвая дарога,
Быцам колерам вясёлкі,
Асвяцілася для нас.

ЗІМНІЯ РУЖЫ

Ружы зноў у памяці маёй..
Сагравалі іх твае далоні,
Калі нёс халоднаю зімой
Гэты цуд ты мне з любоўю.

Ружы на стале, у іскрыстым шкле,
Прывітанне як ад сэрца сэрцу.
Ружы ў зімні час падружылі нас.
Не магу на іх я наглядзецца...

І як быццам лета расцвіло ў цішы,
І халодны студзень здаўся маем.
Прыгажосць зямлі, прыгажосць душы...
Як яна хвалюе і кранае!

Ружы на стале, у іскрыстым шкле..
Хоць маўчаць - са мною размаўляюць.
Не забудзем мы май сярод зімы –
Ружы пра яго напамінаюць.

АДЗІНЫ

Ты быў для мяне адзіным –
Такім назаўжды застаўся.
Прайшоў па жыцці імкліва
І рана так развітаўся.

Паехаў у свет, далёка,
Ужо не можаш вырнуцца,
З табою гавораць аблокі,
Вясёлкі табе смяюцца.

Ты стаў для мяне планетай
У небе такім высокім,
Цябе ўспамінаю светла,
Прыгожы мой, яснавокі.

Цябе ўспамінаю ў скрусе
І у радасныя хвіліны,
Я жыць без цябе вучуся,
Найдаражэйшы, адзіны.

МУДРЫ ВОСТРАЎ

Жанчына – востраў,
Мужчына – карабель

Востраў заўсёды чакае,
Калі з далёкіх дарог
Яго карабель прыплывае
У порт свой, на родны парог.

І караблі імкнуцца
Хутчэй свае справы ўправіць
І ў родную гвань вярнуцца,
Дзе іх заўсёды чакаюць.

Але нейкі час праходзіць,
І зноў караблю патрэбна
Парадак на моры наводзіць,
Даследаваць новыя землі.

Ды востраў з крыўдай спытае:
– Навошта пачаў збірацца?
Тады карабель адплывае,
Каб больш сюды не вяртацца…

А мудры востраў прамовіць:
– Плыві, я цябе адпускаю,
Хай неба цябе бароніць.
І ведай, што я чакаю.

І ветразь напоўніцца ветрам,
Пачне карабель спяшацца,
Каб зноў і зноў на свой востраў
Вяртацца, вяртацца, вяртацца.

СЯБРОЎСКІ ЗВАНОК

Ты пазваніў нечакана –
Сяброўскі званок звычайны.
Але неяк раптам стала
Так цёпла і хораша мне,
Што ёсць на зямлі-зямельцы
Адно прыгожае сэрца,
А ў сэрцы тым трошкі месца
Пакінута для мяне.

ПРЫЗНАННЕ Ў КАХАННІ

Я ў каханні хацеў прызнацца,
Мая любоя, яснавокая,
Толькі дзе такіх слоў набрацца,
Каб пачуцці раскрыць высокія?

Я сказаў бы табе, як прыгожа
Салаўі спяваюць да рання
І як травы пахнуць мурожныя,
Калі б ты прыйшла на спатканне.

Я б табе паказаў, як вясёлка
Пасля дожджыка ў небе ўстала,
Як вячэрняя першая зорка
Над зямлёю затрапятала,

Як цвітуць васількі ў жыце
І як сонца ўстае на світанні,
Як цудоўна на свеце жыці,
Калі б ты прышла на спатканне.

Я б табе падарыў усё, што маю,
Усе гукі зямелькі мілай,
Усе краскі роднага краю,
Каб была ты толькі шчаслівай.

І сказаў бы, што для мяне ты,
Быццам сонейка яснага ззянне,
Даражэйшая ў свеце гэтым!
Толькі ты прыйдзі на спатканне.

Я ДРУГОГА КАХАЮ

Не хачу я цябе сустракаць,
Але зноў сустракаю.
Не хачу да цябе прывыкаць…
Я другога кахаю.

Толькі вось чамусьці-чаму,
Як цябе сустракаю,
Так прыемна сэрцу майму?
Я ж другога кахаю…

МЕСЯЧЫК ДВУХРОГІ

Месячык двухрогі выглянуў з-за хмаркі,
Асвяціў дарогу міламу майму.
Я яму насустрач выбегу, спаткаю,
Прытулю да сэрца, шчыра абдыму.

Ночка нас схавае ў лугах духмяных
Ад нядобрых, зайздрасных вачэй,
Будзем слухаць мову сэрцаў закаханых.
Хай жа свецяць з неба зорачкі ярчэй!

О мае сцяжынкі, о мае дарогі…
Там ужо не тая музыка гучыць.
Але як убачу месячык двухрогі,
Маё сэрца млее, памяццю ляціць

У мясціны тыя, міла-дарагія,
Дзе юнацтва маё светлае жыло,
І бацькі яшчэ такія маладыя…
А навокал усё пела і цвіло.

ВАЛОЖЫНКА

Валожынка, валожынка,
Дзяўчыначка прыгожанька,
У цябе я закаханы
Даўно і назаўжды.
Як мне з табой спаткацца,
Як мне табе прызнацца
У пачуццях маіх светлых,
У пачуццях маладых?!

Валожынка, валожынка,
Шчаслівая дарожанька
У добрую хвілінку
З табою нас звяла.
І зараз мы з табою
Па той дарожцы, двое,
Як і раней гуляем
Да зорнага святла.

А Я НЕ ВЕДАЛА

А я не ведала, што за любоў
трэба змагацца,
Што тут няспынная патрэбна праца,
Я думала, калі абое мы кахаем,
Свае пачуцці ні на што не прамяняем.

Але сустрэлася табе другая
ў адзін дзень,
І ты пайшоў за ёю, быццам цень,
Забыўся пра свае ты абяцанні,
Як іх і не было -- гадоў кахання.

Ну што табе сказаць,
у тым каго вініць,
Што так душа мая паранена баліць!
Пайшоў - ідзі. І апусцела хата...
Напэўна, я сама і вінавата.

Бо я не ведала, як за любоў
трэба змагацца.
Тваёю ценню стаць, з усім згаджацца?
Адмовіцца, забыцца пра сябе?..
Няўжо такая падабалася б табе?

АВЕ МАРЫЯ

“Аве Марыя” у храме Сафіі,
У храме бялюткім над вечнай Дзвіной,
Стаю ўсхвалявана ў тым Полацкім храме
Арган, быццам памяць, гаворыць са мной.

Музыка велічна, гучна ліецца,
Сабой запаўняе высокі сабор.
І плача слязой ачышчальнаю сэрца,
Душа, нібы птушка, ляціць у прастор.

ЖЫЦЦЁВАЕ ПОЛЕ

Усім нам ад Бога талент даецца,
Лянуемся толькі яго развіваць.
Спачатку жыццё такім доўгім здаецца
І хочацца больш пагуляць!

Жыццё чалавека падобна на сон –
Імгненна яно пралятае.
І ўжо не вярнуць тых растрачаных дзён...
А сёння іх так не хапае!

Жыццё чалавека – марское раздолле,
То ціха на ім, то штарміць.
Жыццё чалавека – бяскрайняе поле,
Дзе кожны ўраджай свой расціць.

Хтось засявае яго пустазеллем,
А хтось – залатым дываном.
Забруджвае нехта смеццем, каменнем,
А хтосьці будуе свой дом.

А ты сваё поле чым засяваеш?
Што ты нашчадкам сваім пакідаеш?

* * *

Няма са мной тваіх вачэй,
І тваіх рук, і тваіх вуснаў,
А сонца з кожным днём ярчэй.
Павольна йду сцяжынкай вузкай.

І абуджаецца жыццё
Ў душы збалелай і самотнай,
І радаснае пачуццё
Кранае цеплынёй пяшчотнай.

Зямелька любая, мой край,
Мая маленькая Радзіма,
Дачку з дарогі сустракай,
Куток мой дарагі, любімы!

РАЗМОВА

Ты гаворыш малітву –
Значыць, гутарыш з Богам,
Просіш міласці, ласкі для ўсіх і сябе,
А чытаеш Евангелле –
Значыць, слухаеш Бога,
Ён з табою гаворыць, навучае цябе.

Чым часцей будзе гэта размова,
Тым бліжэй будзеш ты да Бога.

* * *

З мовай роднай трэба жыць,
Бо яна – душа народа,
Шанаваць яе, любіць,
Гаварыць на ёй заўсёды.

І чужыя вывучаць –
Станеш толькі багацейшы,
І нідзе не забываць:
Мова – дар ад Бога лепшы.

І нясці яе ў жыццё,
Мова родная – святыня.
Бо без мовы мы ніхто:
Не народ і не краіна.

ТЭЛЕФОН

Тэлефон – мой сябрук,
Без яго, як без рук,
Асабліва цяпер,
Бо лютуе, як звер,
Пандэмія.

Тэлефон – вораг мой,
Аднімае сабой
Ен пустой балбатнёй,
Непатрэбнай такой,
Мае сілы.

Скажы, мой тэлефон,
Як цябе зразумець?
Ты маўчыш,
Калі трэба звінець,
Або звоніш і сярод ночы,
Бо нехта пагутарыць хоча!
А пасля такога сігнала –
Ночы як не бывала!

Ну як мне з табой разабрацца?
Дружыць мне з табой ці спрачацца?
А можа зусім развітацца?
О не! Без цябе ўжо мне
А ні дня не пражыць!
Давай будзем дружыць!

ЖЫЦЦЁВАЯ ВОСЕНЬ

Восень наша прыйшла на парог,
А душа яшчэ ў леце блукае,
І не трэба баяцца дарог –
Калі з дому душа маладая.

І ў вачах шчэ агеньчык жывы,
І ўсмешкаю твар расцвітае,
А настрой – усё такі ж баявы,
Восень наша няхай пачакае.

Ты пастой, наша восень, пастой,
Незавершаных спраў яшчэ многа,
Будзь прыгожай для нас, залатой,
Хай жыццёвая тчэцца дарога.

Хай шчэ доўга агеньчык гарыць
І ўсмешкаю твар расцвітае,
Няхай можацца жыць і тварыць…
Восень наша няхай пачакае.

СЛОВА

Паміж першым словам і апошнім
Пралягае цэлае жыццё,
Выказаць любое пачуццё
Можна словам добрым і прыгожым.

Мова наша – божы падарунак,
Мова наша ад дзядоў, матуль,
Як святыню, ты яе шануй,
Гэты дар, і скарб, і паратунак.

Слова роднае – душы крупінка,
Слова сказанае не вярнуць.
Ты яго заўсёды вартым будзь,
Бо са слова пачынаюцца учынкі.

КАБ ПОМНІЛІ

А нам ужо ставяць у віну:
– Ну, колькі ж… Ізноў пра вайну?
Няўжо няма іншых падзей,
Цікавых для нашах людзей?
Калі было тое, калі?
Усе раны даўно зажылі!

А як можна тое забыць,
Калі кожны трэці ляжыць
У маці-зямельцы сырой,
Яе абаронца-герой?!
Яны ў нябыт адышлі,
Каб мы сёння мірна жылі.

А нам ужо ставяць у віну,
Што мы не забылі вайну,
Расказваем унукам і дзецям
Пра страшныя дні, ліхалецце,
Каб помнілі, не забывалі,
Каб мір на зямлі зберагалі.

А дзе людзі памяць згубілі,
Ахвяраў нявінных забылі –
Вайна там ізноў палыхае
І брат у брата страляе.
Няможна без памяці жыць –
Так можна й планету згубіць.

ТВАРЫЦЬ ДАБРО

Восень прыйшла з дажджамі,
З першымі халадамі,
Ды засталося з намі
Летніх дзянькоў цяпло.
Хоць ты далёка зараз,
Хоць мы з табой не разам,
Але дажджам і хмарам
Не астудзіць святло,

Што з нашых душ ліецца,
Іншым перадаецца,
Поўніць людскія сэрцы –
І адступае зло.
Дзе б ні былі мы сёння,
Але заўсёды помнім:
Мы ў гэты свет прыходзім
Толькі тварыць дабро.

МАЛАДОМУ ЧАЛАВЕКУ

На свеце ёсць не толькі зло,
На свеце ёсць яшчэ каханне,
Святло і радасць, сонца ззянне…
На свеце ёсць не толькі зло.
На свеце ёсць такая прыгажосць,
Як першы гром, вясёлка над палеткам,
І пчолка, і пахучы луг улетку…
На свеце ёсць такая прыгажосць!
На свеце ёсць бацькоўскі дом,
Дзе нарадзіўся ты і свет убачыў,
Куды вяртаўся ў час удачы і няўдачы…
На свеце ёсць бацькоўскі дом.
На свеце ёсць настаўнік і ёсць школа.
Далі табе што новае жыццё,
Тваё сумленне, веды, дружбы пачуццё..
На свеце ёсць настаўнікі і школа.
І ўсё гэта з табой, усё тваё,
Якім багаццем ты валодаеш, мой дружа:
Каханне, прыгажосць, пяшчота мужнасць
І ўсё гэта з табой, усё тваё.
Шануй бацькоў, любі свой дом,
Прынось дабро прыродзе, людзям,
Прыгожае стварай, прыгожа думай –
І всет паменшае на зло.

РАЗВАЖАННЕ

Што такое шчасце:
Гэта зразумееш,
Калі тое страціш,
Што цаніць не ўмееш.

Бо хіба не шчасце,
Падумайце самі,
Хадзіць па зямельцы
Сваімі нагамі.

Бачыць, як над лесам
Расцвіла вясёлка,
Слухаць, як спявае
Па вясне салоўка.

Любавацца небам –
Сонечным, блакітным,
Харчавацца хлебам,
Працаю здабытым.

Шчасце – калі любіш
І цябе кахаюць,
Калі цэняць людзі,
Вераць, праважаюць.

Быць не адзінокім,
А з сям'ёй, з сябрамі,
Адчуваць, як пахне
Ветрык мурагамі.

Размаўляць на мове
Матчынай, найроднай,
Жыць свабодна, вольна
У старонцы роднай.

ПАЭЗІЯ

Птушачка песні спявае
Для кожнага і для ўсіх.
Але не кожны мае
Магчымасць паслухаць іх.

Хтосьці далёка – не чуе…
Хтосьці слыху не мае…
Але, каму пашанцуе –
Разам душой спявае.

Асколачкі свайго сэрца
Паэт рассыпае ў вершах.
Хто пачытаць іх імкнецца –
Сам становіцца лепшым.

Паэзія, як і песня,
Не ведае межаў, граніц.
Паэзія – і ёсць песня
З чыстых душэўных крыніц.

ВЕК ЖЫВІ – ВЕК ВУЧЫСЯ

Я калісьці была настаўніцай,
А цяпер я ўсё больш – вучаніца.
Я вучуся ў ластаўкі,
Як гняздо звіць на камяніцы.

Я вучуся ў сонейка,
Што ўсіх саграе, каму холадна,
Я вучуся ў коласа,
Як таго накарміць, каму голадна.

Я вучуся маўчаць, як горы,
Каб каго не пакрыўдзіць звычайна,
І як выстаяць, калі гора,
Не зламацца, калі ў адчаі.

Я вучуся ў дожджыка
Шчодрай быць і дзяліцца,
Я вучуся ў воблачка
Даць у смагу напіцца.

Я вучуся спяваць, як птушка,
Што вяртаецца з выраю, ранняя,
Я вучуся любіць, як дачушка,
Сваёй любай Рідзіме адданая…

“Век жыві – век вучыся”, – казалі,
Ды і веку таго не хапае,
Бо жыццё – гэта школа такая,
Дзе канікулаў не бывае.

Быць настаўнікам – вельмі пачэсна,
Быць настаўнікам – вельмі адказна.
А калі ты настаўнік і вучань:
Гэта -- супер! Гэта – класна!

РОДНАЯ МОВА

Слова роднае, песня матчына,
Мне прапетая над калыскаю,
Мова дзеда майго, як спадчына,
Стала ты мне таксама блізкаю.

Стала ты мне таксама роднаю,
Мова матчына, беларуская,
Мілагучная і пяшчотная,
Як душа майго краю русага.

Мовы іншыя, мовы розныя
Ёсць на свеце, я ўсе паважаю,
Але мову і песню родную
Ні на што я не прамяняю.

МАЛАДЫЯ ГАДЫ

Маладыя гады адышлі, адляцелі,
Іх, як птушак, не вернеш назад...
Замялі іх снягі, запуржылі мяцелі,
І засыпаў сляды лістапад.

Маладыя гады, вашы росныя сцежкі
Да сустрэч, да спатканняў вялі
І дарылі надзею, каханне, усмешкі
І шчаслівыя ночы і дні.

Маладыя гады, наша лепшая песня...
Не вярнуць, не спыніць, не дагнаць.
Вы як мара, як сон, як туман напрадвесні, –
Вас прыемна падчас узгадаць.

Успамінамі тымі душу саграваеш,
Зноў свае пражываеш гады…
І шчаслівым сябе, як тады, адчуваеш
І такім, як тады маладым.

ВАЛЯНЦІНЕ ФРАНЦАЎНЕ ГІРУЦЬ-РУСАКЕВІЧ
(1953 – 2021)

Ты была сярод нас, як праменьчык сонечны,
Такая ж светлая, чыстая, цёплая,
Ты была сярод нас, як дачушка родная
Свайго краю любага, непаўторнага.

Талент свой, свайго сэрца дар
Раздавала ўсім шчодра, радасна,
Каб дабрэй былі, годна каб жылі…
А душа так баліць, плача жаласна.

“Рунь” панікла ў скрусе, журбе,
Хоць і сонейка ласкава песціла,
Ды анелы спявалі ўжо песні табе,
Душу чыстую неба прывеціла.

Ты вучыла любіць і свой край, і ўвесь свет,
Упрыгожваць яго, шанаваць.
Спі спакойна, наш сябра, наш любы паэт,
Твая зорка не згасне. І твой запавет.
Будуць рунеўцы ажыццяўляць.

Змест

Мае тут вытокі , мае карані
ТОЛЬКІ РАЗАМ
***Я жыву на зямлі, што нам дадзена Богам...
РАЁНА СТАЛІЦА
ВАЛОЖЫНУ
Я ЛЮБЛЮ БЕЛАРУСЬ
***Валожынскі край, ты мяне ўзгадаваў...
***Кожны з нас носіць у сэрцы…
ВАЛОЖЫНСКІ ВАЛЬС
ВАЛОЖЫН
МАЛАЯ РАДЗІМА
СЦЯЖЫНКА
УЗБАЛАЦЬ
КАПУСЦІНА
ПОЛАЦК
МАЯ РАДЗІМА, ЛЮБЫ КРАЙ
ГУКІ ЗЯМЛІ
Я ЛЮБЛЮ БЕЛАРУСЬ
МАЯ ДУША ДАМОЎ ІМЕНЕЦЦА
***Я пакінула сэрца ў тым краі...
РУЧЭЙ
МІЛЫЯ МЯСЦІНЫ
МАЯ РАДЗІМА, ЛЮБЫ КРАЙ
***Няма са мной тваіх вачэй...
***Ізноў вясна ў нашым краі...
БЕЛАРУСКІ МОЙ КРАЙ
Лірычнае суквецце
ПАДАРУНАК
***А восень зноў такая ж, як тады...
ВОЗЕРА НАРАЧ
***Падаюць сняжынкі, бы пушынкі белыя...

АСАЛОДА
КАЛІ ЦВІТУЦЬ САДЫ
АДЛЯТАЮЦЬ ЖУРАЎЛІ
КАЛЯДАЧКІ
ЛІСТАПАД
СЕНА-СЕНАЖАЦЬ
ДАЖЫННКІ
ДЛЯ ЧАГО?
ЗАЧАРАВАННЕ ЛЕТА
***Як добра легчы на траву...
ВІТАННЕ
ВЕТРЫК

Маміна школа

ДЗЕНЬ МАЦІ
МАМІНА ШКОЛА
МАЁЙ МАМЕ
МАМЕ
***Прабач мяне, Мама, прабач мяне, Тата...
НАКАЗ
НЕ ШКАДУЙЦЕ ДОБРЫХ СЛОЎ
АБНІМІ
ЗАЎСЁДЫ КАХАЮ
***Былі мы такімі няўмелымі...
ДА ЦЯБЕ І З ТАБОЙ
БУДЗЬ ШЧАСЛІВЫ
ТАБЕ, ДАЛЁКАМУ...
“ВАЛЯНЦІНКА”
ЗІМНІЯ РУЖЫ
АДЗІНЫ
МУДРЫ ВОСТРАЎ
СЯБРОЎСКІ ЗВАНОК
ПРЫЗНАННЕ Ў КАХАННІ
Я ДРУГОГА КАХАЮ

МЕСЯЧЫК ДВУХРОГІ
ВАЛОЖЫНКА
А Я НЕ ВЕДАЛА

Струны душы

АВЕ МАРЫЯ
ЖЫЦЦЁВАЕ ПОЛЕ
***Няма са мной тваіх вачэй...
РАЗМОВА
***З мовай роднай трэба жыць...
ТЭЛЕФОН
ЖЫЦЦЁВАЯ ВОСЕНЬ
СЛОВА
КАБ ПОМНІЛІ
ТВАРЫЦЬ ДАБРО
МАЛАДОМУ ЧАЛАВЕКУ
РАЗВАЖАННЕ
ПАЭЗІЯ
ВЕК ЖЫВІ – ВЕК ВУЧЫСЯ
РОДНАЯ МОВА
МАЛАДЫЯ ГАДЫ
ВАЛЯНЦІНЕ ФРАНЦАЎНЕ ГІРУЦЬ-РУСАКЕВІЧ

Літаратурна-мастацкае выданне

ШАКУН Марыя Антонаўна

ТВАРЫЦЬ ДАБРО

Вершы

Рэдактар
Т. М. Якаўлевіч

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
Л. У. Гатавіцкая

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by